УДК 930"18"(061.341)

# SOFT POWER ІМПЕРЫІ: ДА ПЫТАННЯ ПРА СПЕЦЫФІКУ РАСІЙСКАЙ АГРАРНАЙ ПАЛІТЫКІ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ АПОШНЯЙ ЧВЭРЦІ XVIII – ПАЧАТКУ XIX ст

***Віталь Кірыленка***
*Ліцэй БДУ, Мінск, Беларусь*
v.kirylenka@lyceum.by

У артыкуле робіцца спроба сістэмна прааналізаваць стратэгію канцэпту soft power Расійскай імперыі на беларускіх землях у 1772–1801 гг. як сукупнасці палітыка-ідэалагічных тактык, увасобленых у захадах па распараджэнні зямельнымі фондамі. Пазначана агульная палітыка-ідэалагічная накіраванасць і характар аграрнай палітыкі як спробы карыстання soft power на беларускіх землях падчас праўлення Кацярыны II і Паўла I, што была страчана падчас праўлення наступных імператраў імперыі Раманавых

***Ключавыя словы: soft power, аграрная палітыка, імперыялізацыя, раздача маёнткаў, зямельна-саслоўная палітыка, Рэч Паспалітая, Расійская імперыя***

# EMPIRE SOFT POWER: THE PROBLEM OF AGRARIAN POLITIC SPECIFIES ON BYELORUSSIAN LANDS (END XVIII – BEGINNING XIX)

***Vital' V.Kirylienka***
*BSU Lyceum, Minsk, Belarus*

The article attempts to systematically analyze the strategy of the soft power concept of the Russian Empire in the Belarusian lands in 1772–1801. as a set of political and ideological tactics embodied in measures to dispose of land funds. The general political and ideological orientation and character of agrarian policy as attempts to use soft power in the Belarusian lands during the reign of Catherine II and Paul I, which was lost during the reign of the next emperors of the Romanov Empire

***Keywords: soft power, agricultural policy, imperialization, distribution of estates, land class policy, the Polish-Lithuanian Commonwealth, the Russian Empire***

Вывучэнне гістарычных феноменаў беларускіх земляў на пераломным этапе пераходу з дзяржаўных структураў Рэчы Паспалітай і ВКЛ у палітычнае, эканамічнае і сацыякультурнае поле Расійскай імперыі заўсёды выклікае асаблівую зацікаўленасць. Важнай гісторыка-сацыяльнай праблемай гэтага перыяду падаецца палітыка пецярбуржскага ўраду, накіраваная на гамагенізацыю і прыпадабненне інкарпараванае тэрыторыі, што пазначылі ўніфікацыю беларускіх земляў у расійскія імперскія структуры, пашыранае разуменне якіх прадугледжвае ўключэнне ў дадзеныя паняцці не толькі рэпрэсіўнага, гвалтоўнага (так званая *hard power – жорсткая сіла*), але і канвецыянальнага, кампраміснага (т.зв. *soft power – мяккая сіла*) аспектаў дзяржаўнай улады ў адносінах да аб'ектаў свайго ўздзеяння для дасягнення адпаведных мэтаў.

Перыяд пасля падзелаў Рэчы Паспалітай асабліва важны для акрэсленай праблематыкі, асэнсаванне якога дазваляе высвеліць той гісторыка-культурны кантэкст у якім нараджаўся феномен імперыялізацыі ў пашыраным разуменні, а ў больш позні перыяд бачанне гэтай з'явы выкрышталізоўваецца ў больш вузкае этна-рэлігійнае паняцце акультурацыі, што выкарыстоўвалася надалей у XIX ст. і да апошняга часу ў гістарычнай навуцы. Шматаспектны падыход да імперылізацыі, які ўлічвае перапляценне, узаемапранікненне і ўзаемадзенасць рэпрэсіўных практык з аднаго боку і *soft power* – мяккай сілы – з іншага, што знаходзіцца зараз у стадыі навуковай рспрацоўкі, абгрунтавання і афармлення, на нашу думку, мае большы вытлумачальны патэнцыял, бо разглядае з'яву ў дынаміцы і пераемнасці.

Вызначальнай падаецца распрацоўка паняцця мяккая сіла ("русіфікацыя") ў сучаснай сусветнай (найперш заходняй і расійскай) гістарыяграфіі. А.Мілер сцвярджае, што "больш правільна казаць не пра русіфікацыю.., але пра "русіфікацыі", пра групу рознабаковых працэсаў", што спецыфічна працякалі ў розных гісторыка-культурных кантэкстах [5, сс. 54-55]. Э.Тадэн адрозніваe "адміністрацыйную русіфікацыю" як "палітыку абсалютысцкай адміністрацыйнай цэнтралізацыі другой паловы XVIII ст." ад русіфікацыі XIX ст., што мела на мэце "імкненне насадзіць рускую мову і праваслаўе" [9, pp. 8-9]. Падобнае размежаванне прысутнічае і ў канцэпцыях іншых аўтараў, так, А.Капэлер вылучае "палітычную русіфікацыю" пры Мікалаі I, а моўна-культурную звязвае з палітыкай Аляксандра II ад часоў Студзеньскага паўстання 1863 г., а ўвогуле феномен вызначае як адміністрацыйную, сацыяльную і культурную інтэграцыйную палітыку расійскага ураду [4, сс. 203, 204]. Можна адзначыць, што даследчыкі падкрэсліваюць перапляценне адміністрацыйных, прававых і сацыяльна-эканамічных перадумоў

этнанацыянальнай русіфікацыі другой паловы XIX – пачатку XX ст., а сам феномен імперыялізацыі бачаць як складаную супярэчлівую шматаспектную з'яву, якая працягвае спалучаць абодва падыходы – мяккай і жорсткай сілаў.

Для сучаснай беларускай гістарычнай навукі таксама характэрны зварот да разгляду пецярбуржскай палітыкі на ўскраінах імперыі як адназначна нявызначанай траекторыі спалучэння рэпрэсіўных і дамоўных метадаў дасягнення пастаўленых мэтаў у цэнтралізацыі кіравання, уніфікацыі заканадаўчай, адміністрацыйнай, рэлігійнай, адукацыйнай і іншых сфераў сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага жыцця [7, с. 136; 1, сс. 183-184, 186], пры гэтым асноўная ўвага надаецца моўна-нацыянальнаму аспекту. Разам з тым, аналіз найбольш значных распрацовак паняцця імперыялізацыі (у розных сваіх праявах – *soft power*, русіфікацыі, інш.) пакідае ўпэўненасць, што асэнсаванне такой шматграннай і складанай з'явы не можа засяроджвацца толькі на культурна-моўным праекце, што пачынаецца ад другой паловы XIX ст.

Адштурхоўваючыся ад метадалагічнай праблематызацыі паняцця *soft power* бачыцца неабходным вызначыць разуменне дадзенага феномену ў дачыненні да акрэсленага гісторыка-культурнага кантэксту як палітыкі распаўсюджвання расійскіх імперскіх каштоўнасцяў, норм і практык у адміністрацыйна-прававой, сацыяльна-эканамічнай і культурнай сферах. Зварот да аграрнага аспекту палітыкі імперыялізацыі ў Беларусі канца XVIII – пачатку XIX ст. абгрунтоўваецца вызначальнай роляй ў немадэрнізаваных супольнасцях зямлі і зямельных адносін ва ўсіх сферах грамадства, у якім іерархія сацыяльна-эканамічных і палітычных статусаў дэтэрмінавалася прыналежнасцю да валодання/карыстання зямельнымі рэсурсамі, што ў сваю чаргу вызначала культурныя дамінанты грамадства.

Адным з першых аўтараў, хто звярнуў увагу на імперыялізацыю ў форме "русіфікацыі зямлі", як аднаго з аспектаў *soft power*, быў В.Шміт, які цесна ўвязваў аграрную палітыку расійскіх уладаў на далучаных беларускіх землях з ідэалагічнымі мэтамі. Разглядаючы дадзены працэс Шміт падкрэсліваў, што ён адбываўся не стыхійна і не быў праявай прыватнай ініцыятывы, але здзяйсняўся мэтанакіравана цэнтральным урадам імперыі, хоць і не меў сістэматычнага і дэклараванага характару і зводзіўся ў першаю чаргу да надання маёнткаў расійскаму дваранству [10, ss. 1, 7-8].

Неабходна адзначыць, што сэнс *soft power* у дадзеным выпадку не абмяжоўваецца пашырэннем расійскага землеўладання: можна прасачыць намеры вышэйшых уладаў да сцвярджэння расійскіх імперскіх каштоўнасцяў шляхам раздачы земляў тым, хто кіраваўся гэтымі каштоўнасцямі ў сваёй вайсковай ці грамадзянскай службе і з'яўляўся іх актыўным носьбітам, адначасова з тым, як шляхам канфіскацый адмаўляліся чуждыя каштоўнасці і практыкі, калі зямельнай маёмасці пазбаўляліся непрысягнуўшыя шляхціцы, каталіцкія і уніяцкія ўстановы, паўстанцы [2; 10]. Важным падаецца факт першачарговай раздачы расійскім урадам дзяржаўных, былых каралеўскіх, зямельных уладанняў, што можна разглядаць як сімвалічнае замацаванне расійскай імперскай улады [11, с. 507] разам з палітычнай уладай на далучаных тэрыторыях.

Істотным аспектам аграрнай імперыялізацыі з'ўлялася замяшчэнне соцыякультурных практык ўзаемадычыненняў у аграгнай сферы паміж яе суб'ектамі: земляўласнікам – селянінам – дзяржавай. За часамі Рэчы Паспалітай на беларуска-літоўскіх землях склалася традыцыя прыналежнасці сялянаў да зямлі, а не асабістай залежнасці ад пана, таму не існавала такой практыкі як продаж людзей, што вызначала, паміж іншым, своеасаблівыя стасункі і формы гаспадарання неапасродкаваныя дзяржаўным умяшальніцтвам. З уключэннем беларускіх земляў у Расійскую імперыю пачала здзяйсняцца іншая мадэль аграрных адносінаў, з вызначальнай роляй дзяржавы: пашырэнне продажу сялян без зямлі, набор іх у рэкруты, замена падымнага падатку падушным і інш. [8, s. 243, 326].

Праявай аграрный імперыялізацыі была таксама ломка сацыяльнай стратыфікацыі на далучаных землях, што праяўлялася ў выцясненні і пазбаўленні ўплыву актыўных носьбітаў мясцовай соцыякультурнай і палітычнай традыцыі: разбор шляхты і перавод дробнай шляхты, што не падцвердзіла свой статус, у сялянскі ці мяшчанскі станы, непрызнанне за беспаместнай шляхтай дваранскага статусу, скасаванне стану местачкоўцаў з колькасным пашырэннем прыгону [3, с. 22].

Такім чынам, аграрная імперыялізацыя як мэтанакіраваная палітыка *soft power* канца XVIII – пачатку XIX ст. расійскага ўраду ў Беларусі была непасрэдна звязаны з мэтай стварэння цэласнага цэнтралізаванага дзяржаўнага арганізму з апірышчам на аміністрацыйна-бюракратычны і своеасаблівы землеўладальніцкі рэсурс у выглядзе зямельных ўласнікаў з вялікарускіх земляў і непасрэдных прыхільнікаў пецярбуржскага рэжыму (малдаўска-валашскіх баяраў, остзэйскім баронаў, французаў, англічан і інш., прынятых на імператарскую службу), якія былі не толькі кіраўнічымі і аграрнымі суб'ектамі, але і актыўнымі носьбітамі каштоўнасцяў, норм і практык, чуждых для мясцовай соцыякультурнай прасторы, своеасаблівасці якой паступова нівеліраваліся.

Пазначыўшы спецыфіку першаснай імперыялізацыі беларуска-літоўскіх земляў канца XVIII – першай траціны XIX ст. у яе аграрным аспекце, падаецца мэтазгодным зрабіць спробу акрэсліць дынаміку *soft power* стратэгіі ў пераемнасці яе этапаў (формаў):

1) адміністрацыйна-прававая імперыялізацыя праявілася ва ўвядзенні ўмоваў і стандартаў, як сутнасных, так і фармальных у кіраванні і арганізацыі ўлады на новадалучаных землях, у тым ліку шляхам заканадаўства;

2) аграрна-саслоўная імперыялізацыя характарызавалася пашырэннем расійскага землеўладання, сутнаснымі і фармальнымі зменамі ва ўзаемадачыненнях паміж аграрнымі суб’ектамі і трансфармацыяй мясцовай сацыяльнай стратыфікацыі;

3) моўна-нацыянальная імперыялізацыя (русіфікацыя) распачынаецца на месцах пасля Лістападаўскага паўстання і ахоплівае агульную імперскую палітыку ў перыяд пасля Студзеньскага, яе сутнасць – у фармаванні монаэтнічнай дзяржавы як падмурку для мадэрнізацыі імперыі.

Адзначаныя этапы вылучаны з пэўнай ступеняй умоўнасці, і фактычна ўяўлялі сабой не вельмі сістэмныя, але мэтанакіраваныя спробы паступовай інкарпарацыі беларуска-літоўскіх земляў у структуры Расійскай імперыі. Так, раздача зямельнай маёмасці распачынаеца разам з адміністрацыйнымі пераўтварэннямі, заканадаўчыя новаўвядзенні прасочваюцца на розных этапах, а з’яўленне моўнага кампаненту заўважна да сярэдзіны XIX ст., напрыклад у выглядзе праекту надання расійскіх назваў органам кіравання і “пасадовым месцам” [6, с. 201], таму ў размежаванні этапаў захоўваецца пэўная ўмоўнасць.

Падсумоўваючы асэнсаванне стратэгічных захадаў палітыкі расійскага ўраду пасля далучэння Беларусі ў іх сукупнасці, можна прасачыць наступную максімальна агульную тэндэнцыю імперыялізацыі: да выспявання вялікарускага этнанацыянальнага праекту ў нетрах імперскага арганізму пецярбуржскія эліты абапіралася ў сваёй большасці на *soft power* – адміністрацыйна-саслоўныя і земляўласніцкія рэсурсы традыцыйна-феадальнага грамадства для замацавання на новадалучаных тэрыторыях, тады як этнакультурны праект другой паловы XIX ст. выкарыстоўваў ідэалогіі мадэрнава-індустрыяльнага грамадства з апірышчам на культурна-ментальныя структуры соцыўму з іх моўным і рэлігійным увасабленнем, пры гэтым захоўвалася пераемнасць і цэласнасць працэсу.


1. Анішчанка, Я. Беларусь у часы Кацярыны II (1772-1796) / Я.Анішчанка; пад. рэд. У.Сосна. – Минск : Гум.-Экан. Недзяр. Ун-т, 1998. – 211с.
2. Жукович, П. О русском землевладении в Северо-Западном Крае со времени присоединения его к России / П.Жукович. – СПб.: Печатня С.Яковлева, 1895. – 53 с.
3. Ільяшэвіч, М. Расейская палітыка на землях былага Беларуска-Літоўскага гаспадарства за панаваньне Кацярыны II і Паўлы I (1772-1801) / М.Ільяшэвіч. – Вільня : Друкарня Я.Левіна, 1933. – 24 с.; рэпрынт. выд. 1992
4. Каппелер, А. Россия многонациональная империя: Возникновение. История. Распад / А.Каппелер. – Москва : Прогресс-Традиция, 2000. – 342 с.
5. Миллер, А. Империя Романовых и национализм: Эссе по методологии исторического исследования / А.Миллер. – Москва : НЛО, 2006. – 248 с.
6. Национальные окраины Российской империи: становлении и развитие системы управления / С.Агаджанов [и др.]; Ин-т рос. истории РАН. – Москва : Славянский диалог, 1997. – 415 с.
7. Сяргеенкава, В., Ходзін, С. Русіфікацыя / В.Сяргеенкава, С.Ходзін // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск, 2001. – Т. 6, кн. 1. – С. 136-137
8. Grabski, W. Historia wsi w Polsce / W.Grabski. – Warszawa : Kasa im. Mianowskiego, 1929. – 450 с.
9. Russification in Baltic Provinces and Finland / Thaden, Edward C., ed. Princeton, N.J.: Princeton Univ. Press, 1981; цытуецца па: Миллер А. Империя Романовых… С. 55-56
10. Schmidt, W. Geneza prywatnej rosyjskiej własności ziemskiej w guberniach wileńskiej, grodzieńskiej i mińskiej (1793-1875) / W.Schmidt. –Warszawa: Kasa im. Mianowskiego, 1923. – 104 s.
11. Владимирский-Буданов, М. Обзор истории русского права / М.Владимирский-Буданов. – Ростов-на-Дону : Феникс, 1995. – 640 с.